# ЭЛЕКТРОННЫЯ ДАКУМЕНТЫ

## АСАБІСТЫ КЛЮЧ ЦІ ЎНІКАЛЬНЫ ІДЭНТЫФІКАТАР

Пералік працэдур, якія можна атрымаць у электронным выглядзе, вызначаны пастановай Саўміна № 271. У электронны выгляд паэтапна плануецца перавесці яшчэ каля 300 працэдур, што прадугледжана распараджэннем прэм'ер-міністра краіны, разлічаным да 2021 года. Дакумент вызначае галіновыя дзяржорганы, якія павінны перавесці працэдуры ў электронны выгляд, а таксама тэрміны гэтай работы, расказала **Наталля ФІЛІПАВА, намеснік міністра юстыцыі:**

— Раней большасць працэдур была разлічана на суб'ектаў гаспадарання, а дзякуючы распараджэнню электроннымі мусяць стаць найбольш затапрабаванымі людзьмі паслугі. Гэта, напрыклад, даведка аб стане асобы, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў; аб займаным памяшканні і складзе сям'і; аб месцы жыхарства; аб даванні аднаразовай субсідыі на будаўніцтва ці набыццё жылля. Праз электронную форму можна запрасіць у Беларусь іншаземца; аплаціць падаходны падатак фізічнай асобы; вярнуць празмерна сплачаныя мытныя плацяжы. А таксама здзейсніць шэраг працэдур у сферы рэгістрацыі зямельных надзелаў і нерухомасці.

На пачатку лета пастановай Саўміна № 294 пералік адміністрацыйных працэдур павялічыўся яшчэ на 16 паслуг. Сярод іх, напрыклад, даведка аб наяўнасці (адсутнасці) выканаўчых лістоў ці іншых патрабаванняў аб спагнанні з заяўніка запазычанасці па падатках або іншых нявыкананых абавязках; даведка аб выплаце (утрыманні) падаходнага падатку з фізічных асоб, каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання; даведка аб даходах для вырашэння пытання аб перадачы дзіцяці на ўсынаўленне.

Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў стала даступнай, напрыклад, электронная выдача (засведчанне) даведкі аб пастаянным месцазнаходжанні беларускай арганізацыі, каб пазбегнуць двайнога падаткаабкладання. Рэгістрацыя радыёэлектронных сродкаў і (або) высокачастотных прылад, якія з'яўляюцца крыніцай электрамагнітнага выпраменьвання, грамадзянскага назначэння. Выдача дазволу на правядзенне аэрафотаздымкі і аэрамагнітнай здымкі. А таксама выдзяленне, выключэнне рэсурсу нумарацыі, узгадненне перадачы рэсурсу нумарацыі і некаторыя іншыя працэдуры.

Каб атрымаць доступ да адзінага партала ў залежнасці ад канкрэтнай адмінпрацэдуры, заяўнік павінен мець асабісты ключ электроннага лічбавага подпісу або ўнікальны ідэнтыфікатар (логін і пароль), дадала намеснік міністра:

— Асабісты ключ электроннага лічбавага подпісу можна атрымаць у Нацыянальным цэнтры электронных паслуг www.nces.by, а ўнікальны ідэнтыфікатар выдаецца пры асабістым звароце ў службу «Адно акно» ці таксама ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг. У электронным выглядзе можна, напрыклад, атрымаць пропуск на права ўезду, часовага знаходжання ў пагранічнай паласе ці зарэгістраваць іншаземца, які часова знаходзіцца ў Беларусі. Апошняя паслуга, дарэчы, бясплатная ў электронным выглядзе, але платная — пры асабістым звароце.

Служба «Адно акно» пры гэтым не знікне, упэўнена прадстаўніца Мінюста, бо ёсць частка насельніцтва, якім або проста патрэбны жывыя стасункі, або яны не могуць ці не ўмеюць карыстацца інтэрнэтам.

— Нават калі ўсе адміністрацыйныя працэдуры пяройдуць на электронную пляцоўку, супрацоўнікі «Аднаго акна» стануць своеасаблівымі пасрэднікамі паміж уладай і чалавекам. Яны змогуць скарыстацца ўласным ключом, увайсці ў асабісты кабінет чалавека і здзейсніць адміністрацыйную працэдуру, — тлумачыць Наталля Філіпава.

## КРЫПТАГРАФІЧНАЯ АХОВА І ДАВЕРАНЫ ТРЭЦІ БОК

Воблачныя тэхналогіі — не справа будучыні, а сённяшняя рэаліі, іх трэба выкарыстоўваць, вывучаць і ўкараняць ва ўсіх сферах жыцця, упэўнена **Таццяна ТУРОМША, намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Нацыянальнага цэнтра абмену трафікам.** Менавіта цэнтру прадастаўлена права рэалізацыі адукацыйных паслуг у сферы аховы інфармацыі і інфармацыйнай бяспекі.

— Створана ўжо 12 праграм, а за апошнія месяцы навучанне прайшлі некалькі спецыялістаў і кіраўнікоў краіны, — паведаміла яна. — Гэтыя курсы запатрабаваны, бо спецыялісты могуць атрымаць самыя аператыўныя звесткі ад лектараў-практыкаў у галіне прадухілення кіберзлачынстваў, абмяняцца вопытам будаўніцтва сістэм інфармацыйнай бяспекі непасрэдна ў сваіх арганізацыях, атрымаць кваліфікаваныя тлумачэнні па заканадаўстве ў галіне тэхнічнай і крыптаграфічнай аховы інфармацыі. Ужо даступны курсы для спецыялістаў, якія ўзаемадзейнічаюць непасрэдна з персанальнымі данымі грамадзян.

У Беларусі выдадзена звыш за 900 тысяч электронна-лічбавых подпісаў, і гэта ўжо набыло масавы характар і стала сапраўдным інструментам, да якога прывыкае грамадства, заўважыў **Сяргей РУДНЕЎ, першы намеснік дырэктара Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг:**

— Лічбавы подпіс будзе і на ID-картцы беларуса, якая разлічана на дзесяць гадоў. У працэсе выкарыстання ў розных сферах увойдзе ўсё насельніцтва краіны. Аднак перш чым пераходзіць цалкам на анлайн-паслугі, мы павінны навучыцца карыстацца гэтымі інструментамі. Калі будзе створана тэхналагічная інфраструктура для выкарыстаня подпісу, галоўнае, каб грамадства перайшло на новы этап. Толькі пасля гэтага эвалюцыйнага шляху мы зможам казаць, што афлайн-узаемадзеянне мы перапынім. Мы разлічваем, што насельніцтва ўспрыме магчымасць выкарыстання ID-карткі з электронным лічбавым подпісам з радасцю, бо гэта дазволіць кожнаму з нас не траціць асабісты час на наведванне розных дзяржорганаў і структур. Гэты інструмент можна будзе выкарыстоўваць і ў бізнесе — шэраг працэсаў, якія сёння патрабуюць асабістай прысутнасці, можна будзе цалкам перавесці ў анлайн і атрымліваць неабходную інфармацыю праз дзве–тры хвіліны.

Выкарыстанне беларускага лічбавага подпісу не абмежавана граніцамі краіны. Іншаземец таксама можа атрымаць наш подпіс, праўда, яму першы раз прыйдзецца асабіста прыехаць у рэгістрацыйны цэнтр, каб яго атрымаць. А ўжо потым прадаўжаць яго дзеянне анлайн.

— Пытанні прызнання подпісаў іншых краін таксама ў цэлым вырашаны, — заўважыў спецыяліст. — Існуе тэхналогія даверанага трэцяга боку. Каб яе выкарыстоўваць, неабходна дзве ўмовы: тэхналагічнае забеспячэнне ўзаемадзеяння даверaных трэціх бакоў розных краін-удзельніц, а таксама пагадненне аб прызнанні такога ўзаемадзеяння юрыдычна значным.

Работа па прызнанні электроннага лічбавага подпісу пратэсціравана з Расіяй і Казахстанам, ёсць напрацоўкі ў гэтым кірунку з Азербайджанам.

## ЭЛЕКТРОННАЯ МЕДЫЦЫНА І ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ

Лічбавая трансфармацыя працэсаў адбываецца ў Беларусі і ў медыцыне. Традыцыйнай стала рэспубліканская сістэма тэлемедыцынскага кансультавання, з дапамогай якой праходзяць кансіліумы, электронны рэцэпт і выкарыстанне рэгістраў, якія забяспечваюць аўтаматызацыю ўнутраных бізнес-працэсаў у ахове здароўя ведамства, адзначыў **Віктар СІДАРЭНКА, загадчык сектара праграмна-інфармацыйнага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя:**

— Сярод перспектыў на 2021—2025 гады ў медыцыне тры мерапрыемствы: стварэнне адзінай службы кіравання хуткай медыцынскай дапамогі з выкарыстаннем геаінфармацыйных тэхналогій, арганізацыя сэрвісу па кіраванні службай пералівання крыві (тут акцэнт будзе найперш на фінансава-гаспадарчую частку, але прадугледжаны і вялікі медыцынскі блок: ад каго і калі атрымана данацыя, тэрмін яе захоўвання). Наладжванне тэлемедыцынскага кансультавання па новым прынцыпе: не ўрач — урач, а ўрач — пацыент. Дзякуючы гэтаму любы беларус зможа на дыстанцыі, са свайго дому ці нават з адпачынку атрымаць кансультацыю свайго ўрача, а таксама атрымаць пэўную медвыпіску, прадоўжыць дзеянне электроннага рэцэпта. У выніку мы хочам атрымаць дакладную маршрутызацыю пацыента, каб зняць нагрузку з першаснага звяна. Каб людзі не хадзілі ў паліклінікі па самых нязначных пытаннях.

Летась у ведамстве пачалі ствараць цэнтралізаваную інфармацыйную сістэму аховы здароўя. Гэта тэхналагічная платформа, якая аб'ядноае ўсе арганізацыі аховы здароўя. Цэнтральным элементам платформы стане электронная медыцынская картка чалавека. Вялікі блок прысвечаны міжведамаснаму ўзаемадзеянню з органамі МУС, ЗАГС, таму што ў картцы плануюць адлюстраваць усю інфармацыю пра пацыента ад нараджэння да смерці і нават пасля — пасмяротны анамнез будзе захоўвацца ў сістэме для навуковых і статыстычных мэт і стварэння штучнага інтэлекту.

**Ірына СІДАРОК.**

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

## «ЦЯГНІК ПЕРАМОГІ» ПРЫБУДЗЕ ЗАЎТРА

**У нашай краіне праект рэалізоўваецца Беларускай чыгункай і ААТ «Расійскія чыгункі» ў рамках Года народнага адзінства, ён прымеркаваны да 80-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Праект ажыццяўляецца пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і актыўным садзейнічанні Рэспубліканскага валанцёрскага цэнтра. Унікальны перасоўны музей «Цягнік Перамогі» будзе курсіраваць па Беларускай чыгунцы з 11 да 28 чэрвеня, паведамляе прэс-цэнтр магістралі.**

З 11 да 13 чэрвеня экспазіцыя будзе знаходзіцца ў Мінску, 14–15 чэрвеня яе змогуць наведаць жыхары Оршы, 16–17 чэрвеня — Віцебска. 18 чэрвеня цягнік зробіць прыпынак у Полацку, 19–20 чэрвеня экспазіцыя будзе даступная для прагляду жыхарам Гродна. У Брэсце «Цягнік Перамогі» будзе знаходзіцца з 21 да 24 чэрвеня, жыхары Гомеля змогуць пабываць у музеі 25–26 чэрвеня, а завершыцца паказ экспазіцыі ў Магілёве 27–28 чэрвеня — у Дзень вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




# ЛАГІСТЫКА ЯК ПАКЛІКАННЕ

**Найбуйнейшы ў Беларусі лагістычны аператар РУП «Белтаможсэрвіс» адзначае 22-годдзе. У кантэксце гісторыі лічба невялікая, але для сусветнага гандлю і наладжвання партнёрства і сяброўства паміж краінамі вызначальная. За гэты час кампанія стала найлепшым экспедытарам года і ўзначаліла рэйтынг эфектыўнасці функцыянавання лагістычных цэнтраў Беларусі. Актыўна пашыраецца геаграфія — нядаўна быў адкрыты склад часовага захоўвання ў Мазыры і мультымадальны комплекс у Бабруйску. У рамках ініцыятывы «Адзін пояс — адзін шлях» кампаніяй было адпраўлена больш за 300 вагонаў з прадукцыяй беларускай вытворчасці ў Кітай. Адным з падарункаў кампаніі да дня нараджэння стала прэстыжная прэмія TIBO-2021 для афіцыйнага сайта «Белтаможсэрвіс». Раскажам, як жыве кампанія, для якой няма межаў і якія ў яе планы на будучыню.**

«Белтаможсэрвіс» — найбуйнейшы аператар на рынку лагістычных паслуг Беларусі. Лагістычная дзейнасць грунтуецца на стварэнні ведамаснай лагістычнай сістэмы з выкарыстаннем найноўшых IT-тэхналогій, статусу 3PL-правайдара, развітой інфраструктуры ва ўсіх рэгіёнах краіны. «Белтаможсэрвіс» ахоплівае больш за 1/3 рынку паслуг сярод мытных прадстаўнікоў. Спецыялісты па мытным дэкляраванні прадпрыемства штодня падаюць каля 3000 дэкларацый на тавары. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 305 «Аб сістэме электроннай чаргі транспартных сродкаў у пунктах пропуску», РУП «Белтаможсэрвіс» ажыццяўляе кіраванне дзейнасцю сістэмы электроннай чаргі і з'яўляецца аператарам электроннай чаргі.

«Белтаможсэрвіс» аказвае экспедытарскія паслугі па дастаўцы тавараў ад адпраўніка атрымальніку, якія ўключаюць арганізацыю працэсу перавозкі грузу любым відам транспарту, афармленне перавозачных і іншых дакументаў, неабходных для выканання перавозкі грузу, атрыманне дазволаў органаў кантролю пры экспарце і імпарце тавараў, мытныя фармальнасці, транспарціроўку, кансультаванне па пытаннях арганізацыі перавозак грузаў, вызначэнне патрэбы ў рухомым саставе, выбар віду транспарту, вызначэнне этапаў перавозкі і разлік кошту перавозкі. З 2016 года прадпрыемства з'яўляецца экспедытарам Беларускай чыгункі і аператарам кантэйнерных цягнікоў па тэрыторыі Рэспублікі Беларусь для грузаў, якія ідуць з далёкага замежжа (Кітай).

Для эфектыўнай работы прадпрыемства валодае ўсімі неабходнымі ўмовамі. У лічбах гэта: восем сучасных транспартна-лагістычных цэнтраў класа «А», якія размяшчаюцца ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі, пяць складскіх комплексаў класа «У». Агульная плошча інфраструктуры — 960 000 м$^2$. Будуецца транспартна-лагістычны цэнтр у Віцебскім рэгіёне.

На транспартна-лагістычных цэнтрах прадпрыемства аказваецца шырокі спектр паслуг па мытным афармленні, складской апрацоўцы, маркіроўка акцызнымі маркамі, кантрольнымі (ідэнтыфікацыйнымі) знакамі, у тым ліку з радыёчастотнай пазнакай (RFID — пазнака), па тэхналогіі Data-Matrix для тавараў рынку ЕАЭС. На складах таксама маюцца халадзільныя камеры, сістэмы кантролю доступу да складоў, сістэмы відэаназірання; сістэмы аўтаматызацыі склада, у тым ліку праграмныя прадукты ўласнай распрацоўкі, з дапамогай якіх суб'екты знешнеэканамічнай дзейнасці могуць ажыццяўляць мытныя аперацыі. Доля прадпрыемства на дадзеным рынку паслуг складае 60 працэнтаў.

За 22 гады на прадпрыемстве падабралася вялікая каманда спецыялістаў. Дзякуючы ёй, а таксама тэхнічным, інфраструктурным і чалавечым рэсурсам рацыянальна, эфектыўна, з найменшымі выдаткамі для кліентаў і вельмі аператыўна вырашаюцца нават самыя складаныя лагістычныя задачы.